БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 070(091):947.6

**КОВАЛЬ ВОЛЬГА УЛАДЗІМІРАЎНА**

# ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ ЯК КРЫНІЦА ПА АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ (1939–1960 ГГ.)

07.00.09. – Гістарыяграфія, крыніцазнаўства
і метады гістарычнага даследавання

Аўтарэферат дысертацыі
на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

Мінск 2006

Дысертацыя выканана ва ўстанове адукацыі
«Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт»

Навуковы кіраўнік: доктар гістарычных навук, прафесар Палуян Іван Васільевіч, УА "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт", кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар Іофе Эмануіл Рыгоравіч, УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", кафедра паліталогіі і права

кандыдат гістарычных навук, Валахановіч Ігар Аляксандравіч, начальнік аддзела Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь

Апануючая арганізацыя: ДНУ "Інтытут гісторыі НАН Беларусі"

Абарона адбудзецца 26 кастрычніка 2006 г. у 14.00 на пасяджэнні савета Д 02.01.05 па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8,ауд. 407.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы 22 верасня 2006 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук, дацэнт В. І. Менькоўскі

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Актуальнасць тэмы дысертацыі.*** Для ўсебаковага даследавання дзейнасці акупацыйнага рэжыму, ролі калабарацыянізму, уплыву фашысцкай прапаганды неабходна пашыраць кола існуючых гістарычных крыніц. Нягледзячы на вялікую колькасць даследаванняў па гісторыі Другой сусветнай вайны, многае яшчэ застаецца нявывучаным і недастаткова распрацаваным. Беларускамоўная эмігранцкая перыёдыка, якая выдавалася за мяжой Савецкага Саюза ў час вайны, – адна з такіх новых крыніц.

Вывучэнне перыядычных выданняў, якія выходзілі ў Германіі, дазваляе атрымаць і прааналізаваць інфармацыю пра ролю, месца, функцыянаванне сістэмы прапаганды, якая дзейнічала пад нямецкім кантролем. Даследаванне газет і часопісаў перыяду Другой сусветнай вайны дае магчымасць вывучыць ідэалагічныя ўстаноўкі нацыстаў і іх дзейнасць па фарміраванню палітычных стэрэатыпаў для ўплыву на масавую свядомасць беларусаў. Прапаганда была важнай складаючай часткай таго акупацыйнага рэжыму, без уліку якой меркаванні наконт нямецкай акупацыі і даследаванні дзейнасці пасляваеннай беларускай эміграцыі будуць аднабаковымі і ў пэўнай ступені суб’ектыўнымі.

Пасляваенная эмігранцкая перыёдыка ў часы “халоднай вайны” таксама адыгрывала ролю палітычнай прапаганды. Пры гэтым выкарыстоўваўся вопыт, здабыты пры нацыстах. Пераемнасць матадаў агітацыі і прапаганды з часоў вайны дазваляла шырока асвятляць выдаўцам перыядычных выданняў тэму антысаветызму.

Разам з тым гэтая ж перыёдыка выконвала і іншую функцыю – аб’ядноўвала членаў дыяспары: менавіта на старонках газет і часопісаў таленавітыя беларускія аўтары за мяжой маглі публікаваць свае творы. Перыядычныя выданні беларускіх эмігрантаў з’яўляюцца важнай крыніцай па гісторыі эміграцыі, на старонках перыёдыкі змешчана інфармацыя пра палітычныя, юрыдычныя, арганізацыйныя пытанні эмігрантаў. Прэса не толькі аналізавала сучаснасць, але і звярталася да мінулага. У эмігранцкай перыёдыцы публікаваліся матэрыялы для моладзі, прадстаўнікоў розных прафесій і веравызнанняў, гумарыстычныя, навуковыя артыкулы, паэзія і проза.

У прапанаваным даследаванні крытычна і рознабакова асэнсоўваецца роля перыядычных эмігранцкіх выданняў, праведзена іх сістэматызацыя паводле тэматыкі. Тэма беларускай эміграцыі, яе выдавецкая дзейнасць, знешні ўплыў на дыяспару сталі важным і актуальным пытаннем гісторыі Беларусі.

***Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.***

Тэма дысертацыі была зацверджана на пасяджэнні Савета універсітэта УА “Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт” 27 студзеня 2004 г. (пратакол № 5), тэму удакладнілі на пасяджэнні Савета універсітэта УА “Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт” 30 мая 2006 г. (пратакол № 9).

1628 ар

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага
тэхналагічнага ўніверсітэта

***Мэты і задачы даследавання.*** Мэта кандыдацкай дысертацыі – вывучыць месца і ролю прэсы ў інфармацыйнай вайне таго часу, асаблівасці функцыянавання і ўплыву на грамадскую думку беларускамоўных перыядычных выданняў дыяспары ваеннага і пасляваеннага часу. Рэалізацыя азначанай мэты патрабуе ажыццяўлення шэрагу даследчых дзеянняў.

Задачамі даследавання з'яўляюцца:

- вывучэнне ступені распрацаванасці праблемы ў гістарычнай і публіцыстычнай літаратуры;
- удакладненне агульнай колькасці газет і часопісаў, якія выдаваліся на беларускай мове за мяжой, а цяпер знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;
- вызначэнне спецыфічных асаблівасцяў як усяго масіву перыядычных выданняў беларускай дыяспары, так і асобных груп прэсы;
- сістэматызацыя газет і часопісаў на падставе агульных фармалізаваных прыкмет (назва, месца выдання, храналагічныя рамкі, перыядычнасць, колькасць нумароў, колькасць старонак, прозвішча галоўнага рэдактара, наклад, месца захавання);
- вывучэнне крыніц фінансавання такой прэсы;
- аналіз зместу артыкулаў і прапагандысцкай ролі выданняў.

***Аб'ект і прадмет даследавання.*** Аб'ектам даследавання сталі перыядычныя выданні беларускай дыяспары, якія выходзілі ў свет у час Другой сусветнай вайны і ў пасляваенны час у заходніх краінах свету. Прадмет – змест і ідэйна-палітычная накіраванасць дадзенай перыёдыкі, храналагічныя рамкі, лакалізацыя, часткова атрыбуцыя.

Храналагічныя рамкі матэрыялу, даследаванага ў дысертацыі (1939-1960 гг.), дазваляюць прасачыць эвалюцыю ідэйна-палітычнай накіраванасці эміграцкай перыёдыкі напярэдадні і ў час Другой сусветнай вайны, а таксама пасля яе завяршэння падчас палітычнай адлігі ў СССР.

***Метадалогія і метады праведзенага даследавання.*** Тэарэтычнай і метадалагічнай асновай дысертацыі з'яўляюцца прынцыпы гістарычнага даследавання: аб'ектыўнасць і гістарызм. Для вырашэння пастаўленых задач былі выкарыстаны гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны метады.

***Навуковая навізна атрыманых вынікаў.*** Беларускамоўныя перыядычныя выданні, якія выходзілі ў час вайны, і эміграцкая пасляваенная перыёдыка – гэта малавывучаная гістарычная крыніца. Практычна ўся работа абапіраецца непасрэдна на матэрыялы газет і часопісаў. У ёй упершыню распрацавана пытанне пераемнасці традыцый і вопыту акупацыйных беларускамоўных перыядычных выданняў і пасляваеннай эміграцкай прэсы. У выніку вывучэння новых архіўных матэрыялаў асвятляюцца пытанні дзейнасці выдаўцоў і рэдакцый перыядычных выданняў. Зроблена аўтарская класіфікацыя масавых гістарычных крыніц – беларускамоўнай перыёдыкі,

аналіз тэматыкі выданняў праведзены ў кантэксце сусветнай гісторыі дадзенага прамежку часу, даследавана прычынна-выніковая сувязь тэматыкі выданняў з задачамі выдаўцоў.

***Практычная значанасць дысертацыі.*** Практыная значнасць дысертацыі заключаецца ў тым, што на аснове фактычнага матэрыялу работы, класіфікацыі, аналітыкі і вывадаў аўтара можна скласці больш поўнае, рознабаковае і дакладнае ўяўленне пра фарміраванне трэцяй хвалі эміграцыі, пазіцыі і погляды эмігрантаў, супрацоўніцтва выдаўцоў перыёдыкі з фашысцкімі ўладамі і фарміраванне пасляваенных арганізацый беларускіх эмігрантаў у розных краінах свету.

Работа можа быць выкарыстана пры напісанні дапаможнікаў і хрэстаматый па крыніцазнаўству, гісторыі Беларусі, пры даследаванні матэрыялаў па ваеннай гісторыі Беларусі, гісторыі журналістыкі, літаратуразнаўству, гісторыі беларускай эміграцыі, пра дзейнасць калабарантаў.

Найбольш цікавыя перыядычныя выданні беларускай дыяспары, якія былі выяўленыя падчас даследавання, могуць выкарыстоўвацца пры арганізацыі гістарычных выстаў і музейных экспазіцый.

Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем, якое характарызуе дадзеную беларускамоўную перыёдыку як важную гістарычную крыніцу пры вывучэнні гісторыі Беларусі.

***Асноўныя палажэнні, якія вынесены на абарону.***

1. Перыядычны друк беларускай дыяспары з'яўляецца адной з важных крыніц па айчыннай гісторыі, выкарыстанне якой дазваляе больш грунтоўна і ўсебакова даследаваць розныя перыяды і праблемы нашага мінулага. У выданнях дадзенага часу змешчана многа такіх матэрыялаў, якія цяжка знайсці ў іншых крыніцах. Аднак прыходзіцца канстатаваць, што пакуль гэтыя крыніцы выкарыстоўваюцца нашымі даследчыкамі недастаткова.

2. Значная частка перыёдыкі беларускай дыяспары часоў Другой сусветнай вайны фактычна з'яўлялася складовым элементам нямецкай сістэмы прапаганды. Таму вывучэнне яе патрабуе крытычнага падыходу.

3. У мэтах прапаганды ідэалогіі і палітыкі нацыстаў шырока выкарыстоўвалася гуманітарная праблематыка. Друкаваліся артыкулы па гісторыі і літаратуры Беларусі, краязнаўству, мастацтву, пры гэтым актыўна выкарыстоўвалася нацыянальнае пытанне. Гістарычны аналіз дазваляе вызначыць ролю гуманітарнай праблематыкі ў беларускамоўнай акупацыйнай прэсе як сродку прапаганды нацыстаў.

4. Для даследчыкаў пасляваеннай айчыннай гісторыі значную цікавасць уяўляюць грамадска-палітычныя выданні, якія былі найбольш пашыранай і разнастайнай па тэматыцы часткай эмігранцкай перыёдыкі.

5. Асаблівай увагі заслугоўвае тая частка перыёдыкі беларускай дыяспары пасляваеннага часу, якая прысвечана маладзёжнай, літаратурнай, прафесійнай, гумарыстычнай і рэлігійнай праблематыцы. Характарыстыка кожнай з гэтых

яе катэгорый дазваляе вылучыць агульныя і спецыфічныя тэндэнцыі развіцця, уплыў палітычных падзеяў на тэматыку эміграцкай прэсы.

***Асабісты ўклад суіскальніцы.*** Дысертацыя з'яўляецца самастойным аўтарскім даследаваннем, якое падрыхтавана на аснове работы з архіўнымі крыніцамі, перыёдыкай, гістарычнай літаратурай на рускай, беларускай, украінскай, англійскай, польскай, нямецкай мовах.

Работа карысная сваім крыніцазнаўчым аналізам, аўтар правяла сістэматызацыю гістарычных крыніц, падкрэсліваючы іх важную ролю для поўнага і ўсебаковага асвятлення гістарычных падзей.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі.*** Асноўныя палажэнні работы былі выкладзены ў дакладах і паведамленнях на навукова-практычнай канферэнцыі "Гісторыя, якой няма ў падручніках" (Мінск, 2002); VI Міжнародных Купалаўскіх чытаннях – навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 2002); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца)" (Мінск, 2002); навукова-практычным семінары "Янка Купала ў кантэксце сусветнай літаратуры" (Мінск, 2003); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Руска-беларускае літаратурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучасны стан, перспектывы" (Брэст, 2003); 68-й навукова-тэхнічнай канферэнцыі БДТУ, (Мінск, 2004); VII Міжнародных Купалаўскіх чытаннях – навуковай канферэнцыі "Нараджэнне класіка" (Мінск, 2004); Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 60-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: урокі гісторыі і сучаснасць" (Мінск, 2004); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых даследчыкаў "Садружнасць навук. Баранавічы-2005" (Баранавічы, 2005); 69-й навукова-тэхнічнай канферэнцыі БДТУ (Мінск, 2005); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Вялікая перамога: гераізм і подзвіг народаў", прысвечанай 60-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (Мінск, 2005); Варшаўскай Усходнееўрапейскай канферэнцыі (Варшава, 2005); X Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь "НИРС-2005" (Мінск, 2006); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX–XXI стст. у Беларусі. Да 100-годдзя з дня нараджэння М. М. Улашчыка" (Мінск, 2006); Міжвузаўскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "1941 год – трагедыя і гераізм беларускага народа" (Мінск, 2006).

***Апублікаванасць вынікаў.*** Па тэме дысертацыі апублікавана 15 артыкулаў на 54 старонках.

***Структура і аб'ём дысертацыі.*** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння, спісу выкарыстаных работ і крыніц, дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 136

старонак, з іх спіс выкарыстаных крыніц – 22 старонкі, дадаткі – 7 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 442 назвы.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **“Уводзінах”** даецца характарыстыка сучаснага стану даследавання дадзенай праблемы, раскрываецца паняційны апарат, характарызуюцца храналагічныя і геаграфічныя рамкі даследавання.

У **“Агульнай характарыстыцы работы”** раскрываецца актуальнасць тэмы дысертацыі, вызначаюцца мэта і задачы, аб’ект і прадмет даследавання, метадалогія і метады яго правядзення. Вызначаюцца навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў, фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону. Адзначаецца асабісты ўклад суіскальніцы, апрабацыя вынікаў дысертацыі, колькасць апублікаваных работ, структура і аб’ём дысертацыі.

**Раздзел І. Гістарыяграфія і крыніцы.** Раскрываецца ступень вывучанасці праблемы, даецца гістарыяграфічны аналіз, характарыстыка асноўных крыніц па тэме дысертацыі. Гістарычную літаратуру па вывучаемай праблематыцы можна падзяліць на групы: айчынныя публікацыі пра нямецкую сістэму прапаганды і акупацыйныя беларускамоўныя перыядычныя выданні за мяжой; айчынныя публікацыі пра дзейнасць эміграцкай прэсы беларусаў; мемуарная літаратура; замежныя даследаванні пра газеты і часопісы беларускай дыяспары і гісторыю эміграцыі.

Даследаванне нямецкага акупацыйнага рэжыму пачыналася яшчэ ў савецкі час. У прыватнасці, гэтай праблеме была прысвечана дысертацыя В. Ф. Ранаўскага “Нямецка-фашысцкая акупацыйная палітыка і яе крах у Беларусі”[1].

Адным з першых даследчыкаў акупацыйнай прэсы на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны стаў С. У. Жумар. У сваіх работах[2] аўтар вывучае і сістэматызуе шэраг перыядычных выданняў нямецкай акупацыйнай улады.

Вывучэнню сістэмы варожай прапаганды на Беларусі ў час вайны, яе зместу і ролі прысвечаны дысертацыйныя работы А. Мігуновай[3] і Г. Болсун[4].

---

[1]Романовский В. Ф. Немецко-фашистская оккупационная политика и ее крах в Белоруссии (1941–1944): Дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.02. – Мінск, 1974 – 515 с.

[2]Жумарь С. В. Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны. – Минск: Бел. науч.-исслед. центр документовед. и арх. дела, 1996. – 283 с.; Жумарь С. В. Оккупационная периодическая печать на территории Белоруссии в годы Великой Отечественной войны: Дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. – Минск, 1995. – 129 с.; Жумарь С. В. Библиография оккупационных периодических изданий, выходивших на территории Беларуси в 1941–1944 гг. – Минск: Бел. науч.-исслед. центр документовед. и арх. дела, 1995. – 43 с.

[3]Мігунова А. А. Прапагандысцкая і культурна-асветніцкая дзейнасць нямецкай акупацыйнай улады у Генеральнай акрузе Беларусь (1941–1944): Дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 – Мінск, 1999. – 126 с.

[4]Болсун Г. А. Противостояние немецкой и советской пропаганды на оккупированной территории Беларуси (1941–1944 гг.): Дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. – Минск, 1999. – 110 с.

Польскі даследчык беларускага паходжання Ю. Туронак на аснове дакументальнай базы амерыканскіх, нямецкіх, польскіх архіваў, амаль невядомай раней беларускім даследчыкам, падрыхтаваў кнігу "Беларусь пад нямецкай акупацыяй"[5]. Іншае даследаванне Ю. Туронка пад назвай "Беларуская кніга пад нямецкім кантролем (1939–1944)"[6] прысвечана праблеме беларускай кнігавыдавецкай дзейнасці ў гады вайны. Аўтарам складзены каталог усіх беларускіх кніг з іх падрабязным бібліяграфічным апісаннем. Ю. Туронак актыўна ўжывае матэрыялы беларускіх акупацыйных газет і часопісаў у якасці гістарычнай крыніцы для свайго даследавання.

Значны ўклад у азначэнне тэрмінаў "калабарацыя" і "калабаранты" ўносяць працы А. М. Літвіна[7] і М. І. Семірагі[8]. Праблемам супрацоўніцтва з акупантамі прысвечаны дысертацыі А. М. Літвіна "Антысавецкія ваенна-паліцэйскія фармаванні на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1944 гг. Вытокі. Структура. Дзейнасць"[9] і А. А. Кавалені "Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць"[10]. Тэматыцы калабарацыі прысвечана публікацыя В. К. Коршука[11]. Навукоўцы не толькі грунтоўна даследавалі дзейнасць калабарантаў, але і закранулі праблему іх матывацыі. Навукоўцы не толькі грунтоўна даследавалі дзейнасць калабарантаў, але і закранулі праблему іх матывацыі.

Даследчыца гісторыі беларускай эміграцыі Г. Сяргеева ў сваіх артыкулах[12] вывучае асаблівасці трэцяй хвалі эміграцыі падчас Другой сусветнай вайны, дзейнасць пасляваенных асяродкаў беларускай дыяспары, пытанні ўзаемаадносін з Бацькаўшчынай. Да пытанняў гісторыі беларускай эміграцыі і ролі перыядычнага друку дыяспары ў сваіх артыкулах звяртаецца таксама В. Брыгадзіна[13]. У сваёй кнізе "Три волны" российской советской эмиграции

---

[5]Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. – Мінск: Беларусь, 1993. – 236 с.
[6] Туронак Ю. Беларуская кніга пад нямецкім кантролем (1939–1944). – Мінск: Бел. гістар. агляд, 2002. – 140 с.
[7] Літвін А. Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2000. – 288 с.
[8]Семиряга М. И. Коллаборационизм. Природа, типология и проявления в годы Второй мировой войны. – Москва: Рос. полит. энцикл., 2000. – 863 с.
[9]Літвін А. М. Антысавецкія ваенна-паліцэйскія фармаванні на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1944 гг. Вытокі. Структура. Дзейнасць. – Дыс. …д-ра гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2000. – 286 с.
[10]Каваленя А. А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць: Дыс. … д-ра гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2000. – 260 с.
[11] Коршук В. К вопросу о коллаборационизме в Беларуси в годы Великой Отечественной войны // 55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы: Матэрыялы навук.-тэарэт. канф. 4–5 мая 2000 года. Ч. І. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2000. – С. 152–156.
[12] Сяргеева Г. Беларуская дыяспара ў гады Другой сусветнай вайны // Кантакты і дыялогі. – 1996. – № 9. – С. 25–31.; Сяргеева Г. Беларуская дыяспара і Бацькаўшчына: праблемы ўзаемаадносін // Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзен. – Мінск: БДУ, 1992. – С. 163–173.
[13]Бригадина О. В. О новых источниках изучения истории Великой Отечественной войны / Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца): Матэрыялы Міжнар. навук. канф., 25–27 крас. 2002 г. – Мінск: БДУ, 2003. – С. 87–96.; Брыгадзіна В. Беларуская эміграцыя. Па старонках сучаснага перыядычнага друку Беларусі // Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. – Мінск: БДУ, 1992. – С. 173–176.

(1917–1991 гг.)"[14] В. Брыгадзіна распрацоўвае тэрміналогію для вывучэння гісторыі дыяспары. Даследчыца аналізуе прычыны фарміравання эміграцыйных хваляў, сацыяльны склад эмігрантаў, асобным пытаннем разглядаецца беларуская дыяспара ў кантэксце савецкай эміграцыі.

Перыёдыка пасляваеннай эміграцыі – непасрэная частка прапаганды ў ходзе "халоднай вайны". Кнігі, надрукаваныя ў савецкі час[15], пра заходнія разведкі, дзейнасць замежнага радыё і ўплыў прэсы на свядомасць чытачоў, сталі карыснымі пры вывучэнні метадаў "псіхалагічнай вайны".

Важнымі для напісання дысертацыйнай працы сталі тры бібліяграфіі, выдадзеныя Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Йорку. Самай карыснай для дадзенага даследавання стала апошняя кніга В. Кіпеля і З. Кіпель "Бібліяграфія беларускага друку на Захадзе. Часапісы, газэты"[16]. Аўтары зарэгістравалі ў сваёй бібліяграфіі перыядычныя выданні беларускіх эмігрантаў, якія выходзілі ў храналагічных рамках – ад першай паловы XIXст. да 2000 г.

Кніга польскай даследчыцы Н. Баршчэўскай на беларускай мове "Беларуская эміграцыя – абаронца роднае мовы"[17] з'яўляецца грунтоўнай дысертацыйнай працай лінгвіста. Артыкулы[18] Н. Баршчэўскай з'яўляюцца прыкладам ужывання перыёдыкі дыяспары пры філалагічным навуковым пошуку.

Манаграфія І. А. Валахановіча[19] прысвечана пытанню антысавецкага падполля на тэрыторыі Беларусі. Гісторык даследаваў пытанне дзейнасці заходніх разведак на тэрыторыі Савецкага Саюза, а таксама прасачыў сувязь беларускіх эмігрантаў з дадзенымі структурамі.

Мемуары, створаныя ў эміграцыі, – амаль не кранутая даследчыкамі галіна гістарычнай памяці, якая нясе ў сабе шмат новай інфармацыі па беларускай гісторыі, літаратуры, этнаграфіі і культуры. Мемуарыстыку беларускіх эмігрантаў вывучыў і сістэматызаваў Л. Юрэвіч у сваёй кнізе "Мэмуары на

---

[14] Бригадина О. В. "Три волны" российской советской эмиграции (1917–1991 гг.). – Минск: БДУ, 2003. – 217 с.

[15] Яковлев Н. Н. ЦРУ против СССР. – Киев: Политиздат Украины, 1983. – 298 с.; Кассис В. Б., Колосов Л. С. За фасадом разведок. – Минск: Выш. шк., 1986. – 336 с.; Артемов В., Семенов В. Би-Би-Си: История, аппарат, методы радиопропаганды. – Москва: Искусство, 1978. – 256 с.

[16] Кіпель В., Кіпель З. Бібліяграфія беларускага друку на Захадзе: Часапісы, газэты. – Нью-Йорк: Бел. інстытут навукі й мастацтва, 2004. – 150 с.

[17] Баршчэўская Н. Беларуская эміграцыя – абаронца роднай мовы. – Варшава: Друкарня MWM, 2004. – 368 с.

[18] Баршчэўская Н. Клопат "Бацькаўшчыны" пра чысціню беларускай мовы // Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 15. На шляхах да ўзаемаразумення: навук. збор. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2000. – С. 100–109.; Брашчэуская Н. Эміграцыйная газета "Бацькаушчына" ў абароне беларускае мовы // Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 17. Беларуская дыяспара як пасрэдніца ў дыялогу цывілізацый: Матэрыялы III Міжнар. кангр. беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый" (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снежня 2000 г.). – Мінск: Бел. кнігазбор, 2001. – С. 219–228.

[19] Валаханович И. А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1951 гг. – Минск: БГУ, 2002. – 146 с.

эміграцыі”[20], на старонках якой падкрэслівае важную ролю апублікаваных беларускамоўных мемуараў эмігрантаў у якасці гістарычнай крыніцы.

Успаміны Б. Рагулі “Беларускае студэнцтва на чужыне” карысныя ў фактагалічным плане. Мемуары Янкі Запрудніка “Дванаццатка”[21] распавядаюць пра маладых беларускіх хлопцаў групы “дванаццатка”, аўтар неаднаразова згадвае перыядычныя выданні, асабліва часопіс “Наперад”, выдаўцом якога і была група дванаццаці беларускіх хлапцоў, у тым ліку і сам аўтар.

“Матар’ялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне ў 1939–1951 гадох”[22] Алеся Вініцкага ўяўляюць сабой дастаткова сістэматызаваныя ўспаміны, якія адлюстроўваюць гісторыю эміграцыі. Яшчэ адзін эмігрант Мікола Панькоў[23] свае мемуары і даследаванні па гісторыі беларускай эміграцыі пабудаваў у выглядзе хронікі.

Сярод прац замежных гісторыкаў ёсць частка матэрыялаў, якая не адносіцца напрамую да дадзенай тэмы, аднак дазваляе больш глыбока асэнсаваць праблемы Другой сусветнай вайны, асаблівасці развіцця і дзейнасці пасляваеннай эміграцыі.

Асобныя факты адносна функцыянавання прапаганды і ролі прэсы разгледжаны ў англамоўных і польскамоўных энцыклапедыях[24] па Другой сусветнай вайне. Асобным пытанням гісторыі і дзейнасці беларускай дыяспары ў Амерыцы прысвечаны публікацыі ў амерыканскіх этнічных энцыклапедыях[25].

Кніга Г. Шэфера “Палітыка дыяспары”[26] раскрывае тэрмін і сутнасць дыяспары. Даследчык вывучае механізм стварэння і дзейнасці дыяспары, яе арганізацый і суполак. Грунтоўнае даследаванне гісторыі эміграцыі са старажытных часоў дазваляе зрабіць агульныя высновы і высветліць тэндэнцыі развіцця эміграцыі, характэрныя і для сённяшняга часу.

Публікацыі Я. Мірановіча раскрываюць тэму самасвядомасці беларусаў у Польшчы, у якіх гісторык падрабязна вывучае праблему асветы, друку і беларускай мовы. Кніга Я. Мірановіча “Беларусы ў Польшчы. (1944–1949)”[27] асвятляе пытанне беларускай нацыянальнай меншасці пасля Другой сусветнай вайны ў новых межах Польскай дзяржавы.

---

[20] Юрэвіч Л. Мэмуары на эміграцыі: Крыніцазн. дaслед. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2005. – 332 с.
[21] Запруднік Я. Дванаццатка. – Нью-Йорк: Бел. інстытут навукі й мастацтва, 2002. – 510 с.
[22] Вініцкі А. Матар’ялы да гісторыі беларускай эміграцыі у Нямеччыне ў 1939–1951 гадох. – Мінск: Тэхналогія, 1994. – 234 с.
[23] Панькоў М. Хроніка беларускага жыцьця на чужыне (1945–1984). – Мінск: Бел. гістар. агляд, 2001. – 332 с.
[24] Encyklopedia II wojny swiatowej. – Warszawa: Wydawnictwo Ministerstwa Obrony Narodowej, 1975. – 796 s.; The encyclopedia of the Third Reich. – New York: Macmillan Publishing Company, 1991. – 1150 p.; The Oxford companion to the Second World War. – Oxford: Oxford University Press, 1995. – 1344 p.
[25] Gale encyclopedia of multicultural America. – Detroit, 2000. – Vol. 1. – 222 p. Harvard Encyclopedia of American Ethnic Groups. – Harvard: Harvard University Press, 1980. – P. 182–184.
[26] Sheffer G. Diaspora Politics. – Cambridge: Cambridge University Press, 2003. – 290 p.
[27] Mironowicz E. Białorusini w Polsce (1944–1949). – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 1993. – 220 s.

Палітычнай гісторыі эміграцыі прысвечана публікацыя М. Валанскага "Цэнтры палітычнай эміграцыі з краінаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў 1945–1951 гг."[28]. Тэндэнцыі развіцця прэсы дыяспары непасрэдна маюць сувязь з гісторыяй эміграцыі з Савецкага Саюза. Пытанні пасляваенных лагераў для перасяленцаў, іх культурнай і выдавецкай дзейнасці закранаюцца ў манаграфіі Э. Чомера[29]. Даследчык робіць акцэнт на агульнай эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў Германіі пасля вайны, разглядае месца і ролю эмігрантаў у кантэксце нямецкай гісторыі.

Артыкул З. Крупскай[30] прысвечаны вывучэнню беларускага грамадства ў Польшчы з 1944 да 1988 г., аўтар падае дакладныя лічбавыя дадзеныя па беларускай дыяспары ў Польшчы. Даследаванне А. Мальска-Лустыг[31] прысвечана стэрэатыпным уяўленням афіцыйнай Амерыкі пра савецкую прапаганду і ўяўленням эмігрантаў пра СССР. Пытанням метадаў заходняй прапаганды, тэматыкі і фінансавання прысвечана кніга Дж. Урбана[32]. Аўтар выдатна раскрывае тэму "халоднай вайны", радыёагітацыі і ўплыву на свядомасць народаў савецкага лагера.

Пры вывучэнні прэсы беларускіх калабарантаў і пасляваеннай перыёдыкі былі выкарыстаны архіўна-крымінальныя справы з фондаў архіва КДБ. Пры асвятленні дзейнасці акупацыйных выданняў падчас Другой сусветнай вайны стала карыснай справа беларускага калабаранта Грынкевіча Станіслава Сямёнавіча[33]. Важнымі пры даследаванні ролі пасляваенных перыядычных выданняў беларускай дыяспары былі архіўна-крымінальныя справы Вострыкава Цімафея Акімавіча[34].

Фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь дазволілі даследаваць ролю перыядычных выданняў перыяду Другой сусветнай вайны як часткі сістэмы нямецкай прапаганды, дзейнасці рэдакцый па распаўсюджванню і рэкламе газет і часопісаў. У прыватнасці, доўгі час гісторыкі не мелі доступу да архіўных матэрыялаў прагерманскіх арганізацый. У гэтым кантэксце каштоўным стаў фонд 385 пад назвай "Кіруючы штаб Саюза беларускай моладзі". Пры напісанні дысертацыі былі выкарыстаны матэрыялы 370 фонду

---

[28]Wolański M. Ośrodki polityczne emigracji z krajów Europy Środkowej i Wschodniej w latach 1945–1951 // Wrocławskie Studia Wschodnie. – Wrocław: Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 1999. – S. 55–72.

[29]Cziomer E. Zarys historii Hiemiec powojennych 1945–1995. – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 1997. – 364 s.

[30]Krupska Z. Mniejszość białoruska w latach 1944–1988 w świetle materiałów przechowawanych w Centralnym Archiwum Ministerstwa Spraw Wewnęntrznych / Białoruś, Czechosłowacja, Litwa, Polska, Ukraina. Mniejszości w świetle spisów statystycznych XIX–XX w. / Pod. redakcją J. Kłoczowskiego. T. 3. – Lublin: Instytut Europy Środkowo-Wschodniej. 1996. – S. 42–58.

[31]Malska-Lustig A. Ameryka oczami emigrantów rosyjskich trzeciej fali. – Kraków: Wydawnictwo Uniwersytetu Jagiellońskiego, 2004. – 212 s.

[32]Urban G. Radio Wolna Europa i walka o demokrację. Moja wojna w czasach zimnej wojny. – Warszawa: Prószyński i S-ka, 2000. – 288 s.

[33]ЦА КДБ РБ, спр. 13107, Т. 1.

[34]ЦА КДБ РБ, спр. 14872, Т. 4, ЦА КДБ РБ, спр. 14872, Т. 16.

“Генеральны камісарыят Беларусі”. Фонд 510 “Калекцыя перакладаў дакументаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны” прадстаўлены разнастайнымі паведамленнямі, загадамі, пратаколамі і іншымі нямецкімі дакументамі, сярод якіх сустракаюцца аналітычныя апісанні дзейнасці службаў прапаганды. Пры асвятленні дзейнасці нямецкіх прапагандыстаў важнае значэнне адводзіцца ролі акупацыйных перыядычных выданняў.

**Раздзел 2. “Беларускамоўныя замежныя перыядычныя выданні перыяду Другой сусветнай вайны”** прысвечаны ролі перыядычных выданняў, якія выходзілі за межамі Савецкага Саюза ў гады Другой сусветнай вайны. Падрабязна разглядаецца тэматыка артыкулаў дадзенай катэгорыі, апавядаецца пра выдаўцоў газет і часопісаў, разглядаецца роля беларускамоўнай прэсы ў якасці сістэмы прапаганды фашыстаў.

**2.1. Ідэалагічная накіраванасць беларускай эміграцкай прэсы.** У першым падраздзеле падкрэсліваецца, што нямецкімі ўладамі былі спецыяльна створаны і падтрыманы выдавецтвы беларускамоўных газет і часопісаў у Германіі, у той час калі асноўныя даваенныя цэнтры эміграцыі амаль спынілі сваю выдавецкую дзейнасць. Асаблівасцю акупацыйнай беларускамоўнай перыёдыкі стала залежнасць ад палітычных службаў акупацыйнай адміністрацыі і вялікая ступень кантролю з яе боку за тэматыкай выданняў. Беларускамоўная прэса як на акупаванай тэрыторыі, так і за яе межамі мела агульныя рысы і кірункі развіцця. Самымі пашыранымі выданнямі сталі газеты “Раніца” і “Беларускі работнік”, якія выходзілі ў Берліне. Пры дапамозе прэсы нямецкая ўлада ажыццяўляла мерапрыемствы па агітацыйна-прапагандысцкай рабоце, каб вывезці працоўную сілу ў Германію, прыцягнуць беларусаў да супрацоўніцтва з нямецкай уладай, у тым ліку ў паліцыі, падпарадкаваць фашысцкаму рэжыму мясцовае насельніцтва для абавязковага выканання ваенных, сельскагаспадарчых і прамысловых паставак. Колькасць акупацыйных выданняў узрасла, а роля нямецкай прапаганды значна актывізавалася пасля пералому ў ходзе баявых дзеянняў. Тактыка прапагандыстаў на павелічэнне колькасці прэсы не дала сваіх вынікаў, бо насельніцтва паверыла ў перамогу Савецкага Саюза.

Выкарыстанне ў якасці гістарычнай крыніцы беларускамоўнай акупацыйнай перыёдыкі дазваляе больш аб’ектыўна і ўсебакова прааналізаваць сацыяльную і эканамічную палітыку акупантаў, асаблівасці развіцця калабарацыянізму ў час вайны. Разам з тым даследаванне перыядычных выданняў, створаных беларускімі калабарантамі, дазваляе меркаваць пра ўзровень папулярнасці дадзенай групы перыядычных выданняў, матывы дзейнасці выдаўцоў і сапраўдныя намеры акупантаў.

Падчас Другой сусветнай вайны, акрамя акупацыйных газет і часопісаў, за мяжой выходзіла беларускамоўная прэса, непадкантрольная нямецкаму ураду. У прыватнасці, існавалі беларускамоўныя газеты і часопісы эмігрантаў у Новым свеце. Неакупацыйная перыёдыка значна пашырае тэматыку

беларускамоўных выданняў ваеннага часу. Адметнай рысай гэтых выданняў з'ўлялася перш за ўсё тое, што яны не былі настолькі заангажаванымі, у большасці сваёй не вызначаліся антысавецкай накіраванасцю. Больш за тое, многія з іх стаялі на антыфашысцкіх пазіцыях і з энтузіязмам успрынялі перамогу антыгітлераўскай кааліцыі ў Другой сусветнай вайне.

**2.2. Гуманітарная праблематыка на старонках акупацыйных перыядычных выданняў.** У другім падраздзеле падкрэсліваецца, што гуманітарная праблематыка мела яскрава падкрэсленую нацыяналістычную накіраванасць і знаходзіліся ў рэчышчы нацысцкай ідэалогіі.

Акупацыйная перыёдыка часу Другой сусветнай вайны з'ўлялася арганічнай часткай нямецка-фашысцкай сістэмы прапаганды. Нават і тыя змястоўныя публікацыі гуманітарнай накіраванасці, якія нярэдка з'ўляліся на старонках гэтых выданняў, мелі яскрава падкрэслены ідэалагічны падтэкст. З іх дапамогай нямецкія службы прапаганды актыўна маніпуліравалі нацыяналістычнымі пачуццямі некаторай часткі беларусаў, падтрымлівалі ілюзіі адносна намеру Германіі дапамагчы беларусам у справе іх культурнага і дзяржаўнага самавызначэння. Адначасова прадпрымаліся ўсе захады, каб умацаваць у свядомасці беларусаў тэзіс пра нямецкі прыярытэт, пра тое, што Германія быццам уяўляе сабой носьбіт больш высокай цывілізацыі, што было адным з найважнейшых складовых частак ідэалогіі нацызму.

**Раздзел 3. Перыёдыка беларускай дыяспары 1945–1960 гг.** Разглядаюцца прапагандысцкія метады і сродкі ў час вядзення "халоднай вайны", супярэчнасці паміж групоўкамі беларускіх эмігрантаў і як непаразуменні паміж цэнтрамі дыяспары адлюстроўваліся на старонках перыядычнага друку.

У пасляваенны час эміграцкая перыёдыка становіцца масавай. Пры фарміраванні трэцяй хвалі эміграцыі неабходнасць у перыядычным друку была выклікана патрэбай эмігрантаў у сродку выказвання сваіх поглядаў і выяўлення беларускай прысутнасці.

**3.1. Грамадска-палітычныя выданні пасляваеннага перыяду.** У падраздзеле падаецца характарыстыка гэтай найбольш пашыранай групы газет і часопісаў. Дадзеная група выданняў была разлічана на масавага чытача розных прафесій, узросту і зацікаўленасцяў. Менавіта таму тэматычны спектр закранаў, акрамя палітычных пытанняў, і літаратуру, і гісторыю, і краязнаўства Беларусі.

На прыкладзе грамадска-палітычных выданняў можна прасачыць за зменамі кірункаў грамадскай думкі, вылучыць погляды і перакананні, распаўсюджаныя ў дадзены перыяд часу. На старонках прэсы асвятляліся розныя тэмы эміграцкага жыцця: студэнцтва, рух скаўтаў, справы ДП, культурныя падзеі і г. д. Тут сустракаліся артыкулы пра знешнюю палітыку, ёсць вершы і апавяданні, абвесткі і рэклама. Самымі пашыранымі і папулярнымі газетамі сталі "Бацькаўшчына" і "Беларус".

Менавіта на грамадска-палітычных выданнях яскрава прасочваецца падзел дыяспары на прыхільнікаў "крывіцкай" БНР і БЦР. Два розныя бакі на старонках перыядычнага друку прапагандавалі свае меркаванні і даволі актыўна крытыкавалі праціўніка. На сённяшні дзень застаецца цікавым пытанне вывучэння канфрантацыі прадстаўнікоў розных плыняў, бо пасляваенны перыядычны друк напоўнены скаргамі і абразамі. Для беларускай эміграцыі дадзеная тэма працяглы час была галоўнай.

На прыкладзе грамадска-палітычнага друку асабліва яскрава прасочваецца варожае стаўленне многіх эмігрантаў да БССР. Палітычная крытыка на старонках прэсы была выключна аднабаковая, яе аўтары бясконца ганьбілі абсалютна ўсе бакі жыцця ў Савецкім Саюзе, адначасова яны нават не ўспаміналі пра негатыўныя моманты дзейнасці ўрадаў заходніх краін. Пра тое, што гэтая прэса была палітычным заказам заходніх спецслужбаў, сведчыць і відавочная ідэалізацыя заходняга ладу жыцця і палітыкі.

Важным пытаннем для даследавання стала фінансавая база прэсы эмігрантаў. Самі эмігранты ў сваіх мемуарах і даследаваннях абавязкова падкрэсліваюць прынцып самазабеспячэння газет і часопісаў – збор сродкаў праз падпіску. Бясспрэчна, выданні мелі частку сродкаў дзякуючы падпісцы, аднак цяжка сцвярджаць, што цалкам усе выданні маглі выходзіць толькі за грошы падпісчыкаў, бо колькасць газет і часопісаў вялікая для адносна нязначнай беларускай дыяспары. Можна меркаваць, што ва ўмовах "халоднай вайны" фінансавыя сродкі паступалі і ад спецыяльных службаў з мэтай прапаганды супраць СССР.

Пры характарыстыцы грамадска-палітычных выданняў на беларускай мове, якія выдаваліся за мяжой, асобным пытаннем разглядаюцца беларускія асяродкі краін сацыялістычнага лагера.

**3.2. Маладзёжны, гумарыстычны, рэлігійны, прафесійны, літаратурны, навуковы перыядычны друк.** У другім падраздзеле акрэслены падзел агульнай прэсы па тэматыцы, зроблена аўтарская класіфікацыя масавых гістарычных крыніц.

На аснове ўласнай класіфікацыі асобна вывучаецца перыядычны друк для моладзі, людзей пэўных спецыяльнасцей, літаратурны, рэлігійны, гумарыстычны і г. д. Тэматычная класіфікацыя дазволіла падзяліць шматлікія эміграцыйныя перыядычныя выданні на розныя па памерах групы, даследаванне якіх дало магчымасць вылучыць агульныя прыкметы і тэндэнцыі іх развіцця і дзейнасці.

Беларускамоўныя эмігранцкія перыядычныя выданні побач з палітычнай выконвалі і нацыянальную, асветніцкую, культурную ролю. Прэса дапамагала беларусам у эміграцыі з дня ў дзень выкарыстоўваць, не забываць беларускую мову, захоўваць у сабе і сваіх дзецях беларускія карані. Яна знаёміла эмігрантаў з новымі кніжкамі выдавецтваў, пісала пра дзейнасць беларускіх палітычных, скаўцкіх, рэлігійных арганізацый па-за межамі Беларусі.

Беларускамоўная прэса эмігрантаў дапамагала супрацьстаяць асіміляцыі, садзейнічала задзіночанню беларусаў сярод чужой нацыянальнай масы ў адзіную супольнасць, мінімізавала інфармацыйную ізаляванасць людзей у адносінах навін з Радзімы.

Колькасць і разнастайнасць перыёдыкі ў пасляваенны час няспынна павялічвалася. Газеты і часопісы становяцца масавымі крыніцамі, больш выразна вызначаюцца іх агульныя рысы, тэматыка, кірункі развіцця. З павелічэннем кола чытачоў у выніку новай хвалі эміграцыі пашыраецца тэматыка перыёдыкі, узнікаюць выданні для школьнікаў, студэнтаў, навукоўцаў, вернікаў і г. д. Сярод перыядычнага друку эміграцыі можна знайсці выданні, якія друкаваліся па некалькі копіяў на друкарцы, большасць перыёдыкі рыхтавалася на ратататары, толькі нешматлікія газеты і часопісы выпускалі тыпаграфіі.

Аднак нельга не заўважыць ідэйна-палітычную заангажаванасць эміграцкай перыёдыкі, і ў гэты час яна ў сваёй большасці стаяла на пазіцыях антыкамунізму і антысаветызму, з'яўлялася актыўнай удзельніцай той "халоднай вайны", якую ў пасляваенны час вялі супраць Савецкага Саюза і іншых сацыялістычных краін заходнія дзяржавы.

Дадатак складаецца з 2 табліц, у якіх сістэматызаваны агульны аб'ём інфармацыі пра даты і месца выхаду, месца захоўвання асноўных выданняў беларускай дыяспары, называюцца рэдактары некаторых газет і часопісаў. Ён прадстаўляе сабой важную частку працы, бо перыёдыку ў якасці масавай гістарычнай крыніцы пры вывучэнні неабходна было класіфікаваць, раздзяліць на групы і выдзяліць агульныя тэндэнцыі развіцця кожнага з накірункаў.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Аналіз праведзенага ў дысертацыі матэрыялу дазваляе зрабіць выснову, што перыёдыка беларускай дыяспары з'яўляецца адной з важных крыніц па гісторыі Беларусі і гісторыі эміграцыі. Яе выкарыстанне дазваляе больш грунтоўна і ўсебакова даследаваць розныя аспекты нашага гістарычнага мінулага. Аднак пры гэтым трэба мець на ўвазе, што выкарыстанне такога матэрыялу патрабуе крытычнага падыходу, бо ў многіх выпадках ён характарызуецца суб'ектывізмам і аднабаковай ідэйна-палітычнай трактоўкай падзей. Даследчык павінен аналітычна вывучаць разнастайныя матэрыялы, апублікаваныя беларускімі эмігрантамі, спасылаючыся на ідэалагічныя ўстаноўкі дыяспары і знешнепалітычную сітуацыю пэўнага гістарычнага перыяду. [3]

2. Беларускамоўная акупацыйная прэса, якая выходзіла як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі падчас Другой сусветнай вайны, з'яўлялася часткай нямецкай сістэмы прапаганды. Прэса для нямецкага боку была адным з асноўных момантаў у распаўсюджванні нацысцкіх ідэй, менавіта газеты і часопісы маглі заклікаць да супрацоўніцтва з немцамі, пераконваць беларусаў

у неабходных Рэйху меркаваннях, перыёдыка была прасякнута апантаным антысаветызмам. Менавіта таму пры выкарыстанні газет і часопісаў дыяспары ваеннага часу неабходны крытычны падыход гісторыкаў. Вялікая ступень кантролю з боку палітычных службаў акупацыйнай адміністрацыі абумовіла агульныя тэматычныя і ідэалагічныя кірункі перыёдыкі. Колькасць акупацыйнай прэсы і роля нямецкай прапаганды значна павялічыліся пасля пералому ў ходзе баявых дзеянняў, значна ўзраслі наклады выданняў, штат прапагандыстаў і г. д., аднак чакаемых вынікаў гэта немцам не прынесла. Уплыў прапагандысцкіх лозунгаў і ідэй на чытачоў заставаўся слабым.

Акрамя таго, у час вайны за мяжой выходзіла прэса, якая не знаходзілася пад кантролем нямецкага ўрада. Колькасць такіх выданняў невялікая, бо асноўныя цэнтры беларускай эміграцыі ў Еўропе прыпынілі сваю выдавецкую дзейнасць. Газеты і часопісы прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў Аргенціне ў большасці сваёй не вызначаліся антысавецкай накіраванасцю, многія з іх стаялі на антыфашысцкіх пазіцыях. [6]

3. У прапагандысцкіх мэтах немцамі актыўна выкарыстоўвалася гуманітарная праблематыка. Пры гэтым асаблівы акцэнт рабіўся на нацыянальным пытанні, падтрымлівалася ілюзія магчымасці дзяржаўнай незалежнасці Беларусі пад пратэктаратам фашысцкай Германіі, шырока асвятлялася ідэалогія нацыстаў. У сувязі з гэтым друкаваліся артыкулы па гісторыі, літаратуры, краязнаўству, мастацтву Беларусі. Нягледзячы на шэраг цікавых і каштоўных артыкулаў па гуманітарнай праблематыцы, іх публікацыя на старонках акупацыйных перыядычных выданняў мела падкрэслена прапагандысцкі характар. Аднак вывучэнне ролі акупацыйнай прэсы дазваляе зрабіць выснову, што ўздзеянне на чытачоў ідэалагічных прынцыпаў нацыстаў праз сродкі масавай інфармацыі было нязначным. [11]

4. Грамадска-палітычныя выданні беларускай дыяспары з'яўляюцца гістарычнай крыніцай і для вывучэння сусветнай знешнепалітычнай сітуацыі. У пасляваенны перыяд самай папулярнай і пашыранай групай перыядычных выданняў беларускай эміграцыі сталі менавіта грамадска-палітычныя газеты і часопісы. Тэматычны спектр дадзенай групы выданняў дастаткова шырокі, таму пасляваенныя перыядычныя выданні могуць выкарыстоўвацца даследчыкамі пры асвятленні гістарычных, палітычных, эканамічных, культурных пытанняў. Пры гэтым выданні не былі свабоднымі ад тых ідэалагічных стэаратыпаў, якія фармаваліся падчас "халоднай вайны". Палітычная заангажаванасць эмігранцкай перыёдыкі гэтага часу вызначаецца яскрава падкрэсленым антыкамунізмам і антысаветызмам. Аднак ніякіх крытычных заўваг адносна палітычнай сітуацыі ў Заходніх краінах не выказвалася. З гэтай прычыны пры выкарыстанні шэрагу такіх матэрыялаў пасляваенных гадоў неабходна праводзіць крытычны аналіз інфармацыі. Беларускамоўную прэсу эмігрантаў можна актыўна выкарыстоўваць у якасці асноўнай гістарычнай крыніцы пры вывучэнні гісторыі самой

эміграцыі. Бо менавіта ў газетах і часопісах эмігранты пазначалі ўсе навіны па юрыдычных і эканамічных праблемах беларускай дыяспары. Перыядычныя выданні беларускіх асяродкаў краін сацыялістычнага лагера мелі іншую тэматыку і знешні выгляд, яны агітавалі беларусаў вярнуцца на радзіму, на сваіх старонках паказвалі Савецкі Саюз як моцную дзяржаву, дзе адбываецца эканамічны, палітычны і культурны рост. [5]

5. Шэраг перыядычных выданняў беларускай дыяспары быў аб’яднаны ў тэматычныя групы, такія, як маладзёжная, літаратурная, прафесійная, гумарыстычная і рэлігійная. Кожная з пералічаных катэгорый мае свае асаблівасці развіцця, спецыфічную накіраванасць у тэматыцы і больш вузкае, абмежаванае кола чытачоў. Аўтарская класіфікацыя прэсы эмігрантаў дапамагае прасачыць дынаміку развіцця кожнай групы. Найбольш пашыранымі сярод пералічаных выданняў сталі маладзёжныя, літаратурныя і рэлігійныя газеты і часопісы. Колькасць прафесійных і гумарыстычных выданняў значна меншая, таксама неабходна падкрэсліць непрацяглы час іх існавання, што можна патлумачыць нізкай папулярнасцю сярод прадстаўнікоў дыяспары. Важнае месца ў пасляваенных перыядычных выданнях беларускай эміграцыі займалі пытанні захавання нацыянальных традыцый, супрацьстаянне асіміляцыі і аб’яднання ў групы па інтарэсах. [1]

6. Як сведчаць прыведзеныя ў дысертацыі матэрыялы, многія з супрацоўнікаў беларускамоўнай перыёдыкі, якая выходзіла на акупаванай тэрыторыі, сталі на шлях калабарацыянізму, інакш кажучы, на шлях актыўнага супрацоўніцтва з фашысцкімі ўладамі. Ядро іх складалі тыя, хто яшчэ да пачатку вайны быў у апазіцыі да савецкай улады ці паверыў у нейкія добрыя намеры акупантаў. Яны ставілі сабе за мэту стварэнне беларускага войска і беларускай нацыянальнай дзяржавы пад пратэктаратам гітлераўскай Германіі. Аднак большасць калабарантаў былі далёкія ад нейкіх ідэйна-палітычных прыярытэтаў і спадзяваліся выключна на прагматычную выгаду ад такога супрацоўніцтва.

Па меры пагаршэння становішча на франтах, разгортвання антыфашысцкай барацьбы на акупаванай тэрыторыі, фашысцкія ўлады са свайго боку ажыццявілі шэраг ідэйна-палітычных захадаў, каб падтрымаць такія ілюзіі калабарантаў. Аднак усе іх захады ў гэтым кірунку былі не больш чым гульнёй, якая закончылася крахам. Абсалютная большасць насельніцтва акупіраванай тэрыторыі не падтрымала ні саміх акупантаў, ні іх супрацоўнікаў.

Праблема калабарацыі, яе сутнасць, месца і роля ў жыцці грамадства застаецца актуальнай і ў наш час, калі на шлях супрацоўніцтва з акупантамі становіцца нейкая частка насельніцтва фактычна акупіраваных краін. Маецца на ўвазе, перш за ўсё, сучасная сітуацыя на Балканах, у Афганістане і Іраку. [4]

# СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

## Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках

1. Коваль В. У. Агляд беларускага эмігранцкага перыядычнага друку (1945–1953 гг.) // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, филосифия, история, филология. –Минск, 2005. – Вып. XIII. – С. 71–74.
2. Коваль В. У. Агляд беларускай літаратуры праз эмігранцкую перыёдыку (1945-1953) // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. – Мінск, 2004. – Вып. XII. – С. 97–99.
3. Коваль В. У. Маладзёжная праблематыка ў пасляваенным друку беларускай дыяспары // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. – Мінск, 2006. – Вып. XIV. – С. 120–123.
4. Коваль В. У. Эміграцкая газета "Раніца" як крыніца па гісторыі Беларусі // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. – Мінск, 2004. – Вып. XII. – С. 100–102.
5. Коваль В. У. Эміграцкі друк – крыніца па гісторыі Беларусі / Беларусь у XX стагоддзі: Сб. науч. работ. Вып. 2. – Минск: Водолей, 2003. – С. 153–155.

## Матэрыялы навуковых канферэнцый

6. Коваль В. У. Беларускамоўныя выданні ў Германіі перыяду Другой сусветнай вайны: агляд тэматыкі // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: урокі гісторыі і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск, 29–30 чэрвеня 2004 г.). – Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2004. – С. 201–203.
7. Коваль В. У. Беларуская дыяспара і эміграцкая перыёдыка ў 1920-я – 1939 гг. // Гісторыя, якой няма ў падручніках: Матэрыялы навук.-практ. канф.; Мінск, 27 крас. 2002 г. / Пад рэд. Н. Стужынскай. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2002. – С. 118–126.
8. Коваль В. У. Беларуская літаратура вачыма эмігрантаў 1945–1953 (на прыкладзе газеты "Бацькаўшчына") // Руска-беларускае літаратурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучасны стан, перспектывы: Матэрыялы Міжнар. навук. канф. (18–19 снежня 2003): У 2 ч. Ч. 1; Пад агул. рэд. М. І. Мішчанчука. – Брэст: БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2004. – С. 112–116.
9. Коваль В. У. Беларускі эміграцкі друк – крыніца па гісторыі II сусветнай вайны // Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца): Матэрыялы Міжнар. навук. канф., 25–27 крас. 2002 г. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2003 – С. 83–87.
10. Коваль В. У. Газета "Беларускі работнік" – крыніца па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны // Содружество наук. Барановичи-2005: Материалы Междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 22 февраля 2005 г.: Ч. 1. – Барановичи: БарГУ, 2005. – С. 272–273.
11. Коваль В. У. Перыядычныя выданні беларускай дыяспары ў Германіі (1939–1953 гг.) // Великая Победа: героизм и подвиг народов: Материалы

Междунар. научн. конф., (Минск, 28–29 апреля 2005 г.) – Минск: Институт истории НАН Беларуси, 2006. – С. 114–117.
12. Коваль В. У. Эміграцыйная газета "Бацькаўшчына" як крыніца па гісторыі Беларусі // Да гісторыі беларускай дыяспары: Матэрыялы конкурсу маладых навукоўцаў "Беларускай дыяспары прысвячаецца". – Мінск: Бел. кнігазбор. – Сш. 1. – 2005. – С. 18–24.
13. Коваль В. У. Янка Купала вачыма эмігрантаў: (На аснове эміграцкага друку 1945–1953 гг.) // Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс: VI Міжнар. Купалаўскія чытанні – навук. канф., 4–5 ліпеня 2002 г. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. – С. 100–101.
14. Коваль В. У. Янка Купала на старонках беларускага эміграцкага перыядычнага друку // Нараджэнне класіка: VII Міжнар. Купалаўскія чытанні – навук. канф., 17–18 чэрв. 2004 г. – Мінск: Нац. б-ка Беларусі, 2005. – С. 226–229.

**Тэзісы канферэнцый**

15. Коваль В. У. Перыядычныя выданні беларускай дыяспары (1945–1960 гг.): крыніцазнаўчы аспект // НИРС-2005: Сб. тезисов докладов X Респ. науч. конф. студентов и аспирантов высш. учеб. завед. Республики Беларусь, 14–16 февраля 2006 г.: Ч. 3. – Минск: БГУ, 2005. – С. 217.

## РЭЗЮМЭ

**Коваль Вольга Уладзіміраўна**

**Перыядычныя выданні беларускай дыяспары як крыніца па айчыннай гісторыі (1939–1960 гг.)**

**Ключавыя словы:** перыядычныя выданні, гістарычная крыніца, дыяспара, эміграцыя, акупацыйная перыёдыка, гуманітарная праблематыка, ідэалагічная накіраванасць, грамадска-палітычныя выданні, тэматычная класіфікацыя, хcraналагічныя рамкі.

**Аб'ект даследавання** – перыядычныя выданні беларускай дыяспары, якія выходзілі ў свет у час Другой сусветнай вайны і ў пасляваенны час у заходніх краінах свету.

**Прадмет даследавання** – ідэйна-палітычная накіраванасць дадзенай перыёдыкі, храналагічныя рамкі, лакалізацыя, часткова атрыбуцыя.

**Мэта работы** – вывучыць месца і ролю прэсы ў інфармацыйнай вайне таго часу, асаблівасці функцыянавання і ўплыву на грамадскую думку беларускамоўных перыядычных выданняў дыяспары ваеннага і пасляваеннага часу.

**Мэтады даследавання.** Тэарэтычнай і метадалагічнай асновай дысертацыі з'яўляюцца прынцыпы гістарычнага даследавання: аб'ектыўнасць і гістарызм. Для вырашэння пастаўленых задач былі выкарыстаны гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны метады.

**Навуковая навізна.** У рабоце ўпершыню распрацавана пытанне пераемнасці традыцый і вопыту акупацыйных беларускамоўных перыядычных выданняў і пасляваеннай эмігранцкай прэсы. Практычна ўся работа абапіраецца непасрэдна на матэрыялы газет і часопісаў. У выніку вывучэння новых архіўных матэрыялаў асвятляюцца пытанні дзейнасці выдаўцоў і рэдакцый перыядычных выданняў. Зроблена аўтарская класіфікацыя масавых гістарычных крыніц – беларускамоўнай перыёдыкі, аналіз тэматыкі выданняў праведзены ў кантэксце сусветнай гісторыі дадзенага прамежку часу, даследавана прычынна-выніковая сувязь тэматыкі выданняў з задачамі выдаўцоў.

**Практычнае значэнне.** Работа можа быць выкарыстана пры напісанні дапаможнікаў і хрэстаматый па крыніцазнаўству, гісторыі Беларусі, пры даследаванні матэрыялаў па ваеннай гісторыі Беларусі, гісторыі журналістыкі, літаратуразнаўству, гісторыі беларускай эміграцыі, пра дзейнасць калабарантаў.

## РЭЗЮМЕ

**Коваль Ольга Владимировна**

**Периодические издания белорусской диаспоры как источник по отечественной истории (1939–1960 гг.)**

**Ключевые слова:** периодические издания, исторический источник, диаспора, эмиграция, оккупационная периодика, гуманитарная проблематика, идеологическое направление, общественно-политические издания, тематическая классификация, хронологические рамки.

**Объект исследования** – периодические издания белорусской диаспоры, выходившие в свет во время Второй мировой войны и в послевоенное время в западных странах мира.

**Предмет исследовании** – идейно-политическая направленность данной периодики, хронологические рамки, локализация, частично атрибуция.

**Цель работы** – изучить место и роль прессы в информационной войне того времени, особенности функционирования и влияния на общественную мысль белорусских периодических изданий диаспоры военного и послевоенного времени.

**Методы исследования.** Теоретической и методологической основой диссертации являются принципы исторического исследования: объективность и историзм. Для решения поставленных задач были использованы историко-генетический, историко-сравнительный, историко-типологический и историко-системный методы.

**Научная новизна.** В работе впервые разработан вопрос преемственности традиций и опыта оккупационных белорусскоязычных периодических изданий и послевоенной эмигрантской прессы. Практически вся работа опирается непосредственно на материалы газет и журналов. В результате изучения новых архивных материалов освещаются вопросы деятельности издателей и редакций периодических изданий. Сделана авторская классификация массовых исторических источников – белорусскоязычной периодики, анализ тематики изданий проведен в контексте всемирной истории данного отрезка времени, исследована причинно-следственная связь тематики изданий с задачами издателей.

**Практическая значение.** Работа может быть использована при написании пособий и хрестоматий по источниковедению, истории Беларуси, в исследовании материалов по военной истории Беларуси, истории журналистики, литературоведению, истории белорусской эмиграции, о деятельности коллаборантов.

## SUMMARY
**Koval Volha**
**Periodicals of the Belarusian diaspora as a source of the national history (1939–1960)**

**Key words:** periodicals, historical source, diaspora, emigration, occupational periodicals, humanitarian problems, ideological tendency, public and political periodicals, thematic classification, chronological frameworks.

**The object of the investigation** are the periodicals of the Belarusian diaspora published during the Second World War and the post-war time in western countries of the world.

**The subject of the research** is ideological and political direction, chronological frameworks, localization, partial attribution of the given periodicals.

**The aim of the dissertation** is to explore the place and the role of the press in the information war of that time, to investigate peculiarities of functioning of the Belarusian periodicals of the diaspora during the War and post-war time and their influence on public opinion.

**The methods of the investigation.** The theoretical and methodological basis of the dissertation are principles of historical research: objectivity and historicism. Historical-genetic, historical-comparative, historical-typological and historical-systemic methods are used in the work.

**Scientific novelty.** The novelty is accounted for by the fact that this research is the first to study succession of traditions and experience of the occupational Belarusian-language periodicals and the post-war emigrant press. The research is based on materials of newspapers and magazines. Activities of publishers and editors of periodicals are described on the basis of the archival materials, which haven't been studied earlier. The author is the first to make an original classification of mass historical sources (Belarusian-language periodicals). The analysis of subjects of the editions is carried out in the context of the world history of the given period of time; the interrelations of subjects of editions with problems of publishers are investigated.

**Practical value.** The results of the research can be used at compiling manuals and textbooks on source study, history of Belarus, military history of Belarus, history of journalism, literary criticism, history of Belarusian emigration, and activities of collaborators.

**Коваль** Вольга Уладзіміраўна

**ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ ЯК КРЫНІЦА ПА АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ (1939–1960 ГГ.)**

Падпісана да друку 20.09.2006. Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Таймс. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,3. Ул.-выд. арк. 1,2.

Тыраж 90 экз. Заказ 524.

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт".
220050, Мінск, Свярдлова, 13а. ЛИ № 02330/0133255 ад 30.04.2004.

Аддрукавана ў лабараторыі паліграфіі установы адукацыі
"Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт".
220050, Мінск, Свярдлова, 13. ЛП № 02330/0056739 ад 22.01.2004.